
Самапомач

Беларуская кооперацыйна-гаспадарчая часопісь

Год III. | Вільня, Кастрычнік 1934 г. | № 10.




Хай злыдні над намі,
скрыпочуць зубамі
Любі сваю ніву, свой
край,
І, колькі ёсьць сілы,
да самай магілы
Ары, барануй,
засявай!.

ЯНКА КУПАЛА

Усе вялікія падзеі народаў і ўсе цывілізацыі былі створаныя дабравольнымі стараньнямі аб'яднаных людзей... самапомаччу.

Джордж РЭССЭЛЬ (Ірляндзец).



ЗЬМЕСТ №10 (27).

Ceny ŭ Vilni

27.IX.34 h.

Zbožža.

Ceny pry kupli-prodažy za 100 kilo:

Žyta I sortu		16.20
Avios standartovy	15.15	15.25
Muka pšaničnaja I-C		31.25
Siemia lnianoje	36.62 -	40.75

Ceny orjentacyjnyja (z papiarednich dzion).

Žyta II sortu	15,00—15,25
Pšanica	18,50—19,50
Jačmień na pansak, źbirany	15,00—15 50
Muka, žytniaja 55%	24.00—24.50
Muka žytniaja 65%	19.75—20 50
Muka žytniaja sitkovaja	16 00 -16.50
Muka žytniaja razovaja	16.00 -16 50
Votruby žytnija	9 75 -11 25
Siena	5.00— 6 00
Sałoma	3.00— 4.00
Bulba stałovaja	4.00 — 4 50

Małočnaje, 12.X.34.

Masła najlepšaje, za kilo ŭ hurcie		2.90
„ „ „ „	u detalu	3.20
Masła stałovaje za kilo ŭ hurcie		2 70
„ „ „ „	u detalu	3 00
Masła solenaje za kilo ŭ hurcie		2 40
„ „ „ „	u detalu	2 70
Syr navahradzki, za kilo ŭ hurcie		2 40
„ „ „ „	u detalu	2.80
Syr litoŭski, za kilo ŭ hurcie		1 70
„ „ „ „	u detalu	2 00
Jajki, kapa		3.90—5 10
„ štuka		ad 8 da 10 hrašoŭ.

Miasnoje 27.IX.34.

Vałovina, całyja štuki	0 70 - 0.90
„ zady	0.80—1.00
„ pierady (košer)	0.90—1.20
Baranina	0.75 - 0 95
Cialacina, 1 hat.	— — —
Svinina	1 00—1.15
Skury bydlačyja, syryja, za kilo	1 00—1 05
Aŭčynki aviečyja, za štuku	3.75—4.00

„Самапомач"

Часопісь выходзіць раз у месяц.

Падпісная плата аднаго экзэмпляра каштуе:

На год . . . . 3.— зл.
На паўгода . . . . . 1.75 „
На 3 месяцы . . . . . 1.20 „

Заграніцу — ўдвая даражэй.

Цана асобнага нумару 40 грашоў.

Цана абвестак паводле ўмовы.

Коопэратывы, гурткі і прыватныя асобы, што выпісваюць на адзін адрэс найменш 10 экзэмпляраў „Самапомачы" (камплект), плацяць за экзэмпляр толькі **1.20** зл. за 10 экз. 12 зл.

Грошы на «Самапомач» пасылаць на чэкавае конто інж. Клімовіча у П.К О. Nr 180 485, а ўсякія пісьмы — на адрэс:

Redakcyja „Samapomač", Vilnia, Połackaja vul. 4 - 10
(Wilno, Połocka 4—10).

Рэдакцыя адчынена ў аўторкі і пятніцы ад 9-ай да 11-ай гадз. дня.

Samapomač

BIEŁARUSKAJA KOOPERATYŬNA-HASPADARČAJA ČASOPIŚ.

Adres: VILNIA (Wilno), Połackaja vul. 4—10.

Самапомач

Hod III.	Vilnia, Kastryčnik 1934 h.	Nr 10 (27).

KOOPERATYŬNYJA NAVINY.

Z 14-ha Miżnarodnaha Kooperatyŭnaha Kanhresu. U mižčasie ad 4-ha da 6-ha vieraśnia sioleta ŭ Londanie, jak my ŭžo pisali, adbyvaŭsia Miżnarodny Kooperatyŭny Kanhres, u jakim uziali ŭčaście kooperatary z 33 dziaržavaŭ. Haspadarom Kanhresu byŭ Miżnarodny Kooperatyŭny Sajuz, ab dziejnaści jakoha za čas ad 1930 hodu daŭ spravazdaču sekretar hetaha Sajuzu, anhličanin Henry May. Paśla spravazdačy pačałasia dyskusija haloŭnym čynam nad nastupnymi punktami: 1) pałažeńnie kooperacyi ŭ śviecie, 2) vystupleńnie z Sajuzu niamieckaj spažyvieckaj kooperacyi, 3) sprava źmieny ročdelskich pryncypaŭ, 4) prapahanda kooperacyi ŭ tych krajoch, dzie jana dahetul słaba raźvita, 5) źmiena statutu Miżnarodnaha Kooperatyŭnaha Sajuzu ŭ tym sensie, kab tudy ŭstavić punkt ab ahulnym abaviazku vykonyvańnia ročdelskich praviłaŭ kooperacyi ŭsimi siabrami Sajuzu.

U dyskusii nad hetymi pytańniami šmat času zaniała sprava vystupleńnia z Sajuzu kooperacyi niamieckaj. Niekatoryja z prysutnych (madziary) radzili nia tolki nie pazbyvacca ŭ Sajuzie niemcaŭ, ale navat zaprasić fašystaŭskich italjancaŭ. Prociŭ hetaha paŭstali balšaviki i čechi i da praviadzieńnia prapazyki madziaraŭ nie dapuścili.

Najvažniejšym adnak punktam naradaŭ była sprava ŭstaŭleńnia ŭ statut Sajuzu ročdelskich praviłaŭ kooperacyi, jak abaviazkavych dla ŭsich nacyjanalnych Sajuzaŭ. Heta sprava była zahadzia Sajuzam pryhatavana, była navat vydzielena asobnaja kamisija, jakaja razhledziła hetyja. zdavałasia-b, nienarušymyja praviły kooperacyi i rezultaty svaje pracy pradstaviła Kanhresu ŭ hetkaj formie: ŭsie haloŭnyja pryncypy kooperacyi, vypracavanyja ročdelskimi pačynalnikami, Kamisija padzialiła na dźvie častki. U pieršaj byli ŭstaŭleny tyja punkty, jakija, pa dumcy Kamisii, pavinny byli skroś u kooperacyi abaviazvać; da druhoj časci ŭznoŭ adniesieny byli tyja z praviłaŭ, jakija — pa dumcy tej-ža Kamisii — abaviazvać usiudy nia mohuć, ale pažadana, kab byli pravodžany. Da pieršaj hrupy, usiudy abaviazvajučaj, Kamisija zaličyła nastupnyja praviły: 1) nieabmiežavanaje siabroŭstva ŭ kooperatyvie, 2) demokratyčny ład, 3) tavarovyja zvaroty ad zakupaŭ i 4) umierkavanaje apracentavańnie kapitałaŭ ułožanych u kooperatyvu. Da hrupy praviłaŭ nieabaviazkavych, ale pažadanych, Kamisija zaličyła nastupnyja: 1) palityčnaja i relihijnaja neŭtralnaść, 2) tarhi za hatoŭku i 3) pašyreńnie kooperatyŭnaj śviedamaści.

Nad hetymi prapanovami ŭsiesajuznaj Kamisii pačałasia doŭhaja dyskusija, jakaja ŭ kancy kancoŭ končyłasia tym, što ŭsia sprava była nanova adasłana ŭ Kamisiju dziela razhladu i pieraapracoŭki. Usich pry hetym ździviła, što suproć prapazykaŭ Kamisji vystupili ni bolš ni mienš, jak samyja anhličanie. Jany pierad usim Kanhresam dakazvali, što nia mohuć zhadzicca na neŭtralnaść palityčnuju i nie pryznajuć mahčymym pradavać tolki za hatoŭku. Pradstaŭnik anhličanaŭ, staršynia Brytanskaj Unii, hram. Hayward kazaŭ pry hetym dasłoŭna: *„chočam, kab urad u parlamancie byŭ zaležnym ad našaj voli... chočam vieści palityku i budziem jaje vieści, a neŭtralnym chaj budzie Sajuz"*.

Vidać z hetaha, što anhlickija kooperatary nie zdavalajucca ŭžo, kab kooperacyja ŭ ich była tolki „pryvatnaj spravaj sumleńnia", ale chočać kooperatyŭnyja pryncypy zavieści ŭva ŭsim publičnym — i dziaržaŭnym — žyćci. — Dobraja heta reč. Škada tolki, što dziela hetaha ŭsia sprava kooperatyŭnych praviłaŭ pavandravała ŭznoŭ na nieaznačany lik hadoŭ pad zialonaje sukno roznych kamisijaŭ ci padkamisijaŭ.

Stanoviśča anhlickich kooperataraŭ pakazvaje ichnuju siłu. Možna im hetaha vinšavać i... pazajzdravać. Asabliva siahońnia, kali ŭ całym radzie dziaržavaŭ kooperacyja tak asłabieła, što nia tolki nia dumaje nastupać na dziaržavu, ale sama spakojna paddajecca roznym procikooperatyŭnym nakazam z-vonku i pamału, ale systematyčna, tracić svoj s a m a d a p a m a h o v y charaktar. Biada tymbolšaja, što pradstaŭniki kooperacyi z hetych krajoŭ na Kanhresie ani raziavilisia ab tym, jak-by suproć takich nastupaŭ supolna prociŭstavicca. — A moža jany, pradstaŭniki, zabaviazalisia maŭčać, słuchać i vykonyvać što prykažuć?

„Społem!" nie dalacieŭ. Šmat šumu narabili ŭ Polšcy ŭ prošłym miesiacy vypieradki na samalotach. U hetych vypieradkach brała ŭčaście i polskaja spažyvieckaja kooperacyja, sajuz katoraj «Społem!», na sabranyja ad kooperatyvaŭ hrošy, kupiŭ taksama samalot — takaja ŭžo siahońnia moda — achryściŭ jaho svaim sobskim imiem „Społem!" i puściŭ lacieć.

HRECH CI ABAVIAZAK?

(Z pryčyny Mižnarodnaĥa Dnia Aščadnaści).

Prybližajecca ŭznoŭ dzień 31 kastryčnika, dzień, u jakim uvieś kulturny śviet dvaccaty ŭžo raz budzie ŭspaminać značeńnie aščadnaści ŭ žyćci jak paasobnaha čałavieka, tak i celych narodaŭ. Značeńnie aščadnaści i dla nas biełarusaŭ tak vialikaje, što abminać hety dzień maŭčańniem nijak nia možna...

Siahońnia, kali aščadnaść — z niedastatku — pasuniena ŭsiudy da hranicaŭ mahčymaści, samo słova „aščadnaść" nie ŭ adnaho z nas vyklikaje złosnuju ŭśmiešku. Jak-ža, zdavałasia-b, možna jšče havaryć ab aščadnaści, kali ŭžo pa vioskach našych sialanie, chavajučysia ad zyrkaha voka ŭsiakaha načalstva, ščepiać adnu manapolnuju siarničku na čatyry čaści? Ci-ž možna sapraŭdy havaryć jašče ab bolšaj aščadnaści?

Niama sumlivu, što pałažeńnie ciažkaje, ale heta jšče nia dokaz, kab ab aščadnaści, jak takoj, zusim nie havaryć. Chutčej naadvarot. Čym ciažejšaja chvaroba — a sučasny kryzys chvarobaj jość — tym bolšaja patreba jaje lačyć, niezaležna ad taho, ci leki buduć horkija ci sałodkija, pryjemnyja ci abrydłyja— lačyć treba. Tak i z aščadnaściu, bo i jana jość svajho rodu lekam na pieražyvany kryzys.

Ale aščadnaść maje jšče i inšuju svomaść: jana siłaj kanieśnaści zmušaje čałavieka žyć pavodle jahonaha-ž kišania. Heta siahońniašniamu čałavieku, pryvykšamu žyć na „raty", na „zalički", na zarabotak katoraha jšče nie zarabiŭ, — nie padabajecca. Paślavajennyja „volnaściovyja" daradčyki šmat kaho navučyli damahacca sabie „pravoŭ" i materyjalnych vyhodaŭ, ale nie navučyli tak pracavać i žyć, kab mieć za što spoŭnić svaje pažadańni „słušnaha žyćcia". I ŭ hetym biada, bo aščadnaść nieŭmalima nakazvaje čałavieku: *Pierš zarabi, a paśla vydaj, ale ni ĥraša bolš čym zarabiŭ.* Nie paturaje heta ludzkoj słabaści, ale zhadžajecca z vymohami haspadarnaści. A heta ŭ haspadarcy važniej za ŭsio!

Heta zaŭvaha adna. Ale jość jašče zaŭvaha druhaja, vuziejšaja, skazać možna — biełaruskaja, u asnovie jakoj lažyć pamiašańnie asnaŭnych paniaćciaŭ. U vyniku hetaha my adnaho, byccam, chočam, a zusim druhoje robim: imkniomsia, byccam, da dabrabytu, ale sam dabrabyt hanim(!).

Skaža mo' niechta: „nia praŭda". — A ci-ž nie vystaŭlajuć u nas na bolš ci mienš publičnyja kpiny čałavieka, jaki zamiest žyć „z pleč u pieč" i paśla być ciažaram dla hramadzianstva, sam, pakul maje siły, pamiataje ab svajej niaviedamaj budučyni? — Jakim pravam ličycca ŭ nas razumniejšym vydać złoŭlenuju załatoŭku na pieršuju lepšuju śviściołku i paśla nia tolki pafaryzejsku chvalicca svaim fałšyvym*) praletarstvam, ale vytykać, a mienš rašučych prosta teroryzavać za toje, što jany nia robiać taho samaha? Čamu knižka aščadnaści źjaŭlajecca takim „niebiaśpiečnym" dakumentam, što na zachavańnie ŭ sakrecie jejnaha źmiestu patrebny až specyjalny bankovy zakon?

Hetkich prykładaŭ možna naličyć biez kanca. Usich ich zradziła i trymaje pry žyćci zabojčaja atmosfera niavolnictva ludzkich słabaściaŭ. I pakul heta atmosfera nia minie, pakul aščadnaść nia staniecca prynamsia tak „modnaj", jak jość siahońnia napr. siarod čynoŭnictva modnym(!) rabić roznyja — i niepatrebnyja — vydatki pa 1-šym kožnaha miesiaca, — datul kvołaja kvietka aščadnaści nie raśćvicie, a tymbolš nia dašć płodu, jakim jość niedaždany d a b r a b y t.

Koratka, kali sapraŭdy chočam dabrabytu, musim navučycca aščadžać; usie inšyja darohi da dabrabytu — heta loteryja i to nadta niapeŭnaja. Aščadžać treba pačynać ad najmienšaha, bo chto nie patrapić aščadžać małoha — nie pabačyć nikoli vialikaha.

Aščadžajma čas — svoj i čužy —, aščadžajma zdaroŭje, aščadžajma najdrabniejšuju častku majemaści, bo z hetaha-ž i składajecca bahaćcie jak kožnaha paasobku, tak i całaha narodu jak całaści. A tady, tolki tady, budziem sapraŭdy „ludźmi zvacca!"

Ale prad tym treba spopularyzavać klič, što aščadnaść heta nie prastupak, ale hramadzkaja cnota, hramadzki abaviazak.

*) Ci-ž nia jość najvyšejšym idealam praletara pierastać być... praletarom?

Ščaście adnak nie padviazło i nadzieja polskich kooperatyvaŭ. samalot „Społem!", u Afrycy ŭviaz, bo ŭ motary jahonym złamałasia voś.

Žmiaščajučy viestku hetu musim vytłumačycca, što z kooperacyjaj, jak takoj, źviazać jaje trudna. Dziela taho adnak, što na hety samalot i samyja vypieradki (challenge) byli źbirany składki — i to vielmi enerhična—i ad našych kooperatyvaŭ biełaruskich, uvažajem za svoj abaviazak paviedamić našych pavažanych čytačoŭ, kudy padzielisia ichnyja hrošy.

Ci Vy ŭžo apłacili padpisku na „Samapomač" za 1934 ĥ., jaki ŭžo dabiaĥaje kanca?

Zrabiecie-ž ĥeta nieadkładna. Jašče siaĥońnia vyšlecie ĥrošy z najbližejšaj pošty praz čekavaje konta P.K.O. Nr. 180.485. Nieakuratnaść padpiščykaŭ ĥeta naša aĥulnaje niaščaście!

ŠTO RABIĆ?

Na hetaje pytańnie, kinienaje ŭ prošłym numary našaj časopisi, pryšło ŭ redakcyju šmat piśmaŭ i dapytaŭ — *što dalej budzie?* Tyja, što dahetul užo patrapili siak-tak sarhanizavacca, z stracham ahladajucca, jak pieratryvać nadchodziačyja časy Uznoŭ tyja, što sarhanizavacca jšče nie patrapili, pytajuć rady, jak-ža tady być, kali mahčymaści kooperatyŭnaha sposabu arhanizavańnia hetak ahraničany ŭsiakimi trudnaściami. Nad usimi-ž visić niejkaja mara niapeŭnaści, čakańnia niejkich novych źmienaŭ — u lepšy ci jšče horšy bok. Što sapraŭdy rabić?

Ahulnuju radu na ŭsio heta dać možna tolki nastupnuju: usiaki ŭstrojvajsia tak, jak možaš. Chto ŭžo paśpieŭ arhanizavacca na sposab kooperatyŭny, z zaniataj placoŭki nie ŭciakaj, ale vytryvała trymajsia. Chto kooperatyŭnaha sposabu z tych ci inšych pryčyn zastasavać nia moža, nia budzie nijakim prastupkam, kali sarhanizuje svaju placoŭku haspadarčuju na asnovach pryvatnych, ale česnych. Najhorš zrobić toj, chto złažyŭšy ruki budzie «siadzieć u mora i čakać pahody», — heta najhoršaje, što moža naahuł być.

Z usiej peŭnaściu zaznačajem, što dumku kinienuju ŭ prošłym numary „Samapomačy" dalej padtrymlivajem, vyjaśniajučy pry hetaj akazii tolki niaścisłaść, što da padanaha prykładu paznanskich „Spółek zarobkowych", jakija byli pierad usim kooperatyŭnyja i zaŭsiody polskija. Hetaha tady vymahała kanieśnaja na ŭsich frontach abarona palakoŭ pad naporam niamieckaści i ŭ hetym arhanizavanym adpory hartavaŭsia najlepš duch narodu. U hetkim pałažeńni znašoŭšysia, paznanskija palaki choć i arhanizavalisia ŭ svaje sialanskija pieradusim kooperatyŭnyja „spółki", to-ž adnak nie pracivilisia, a navat padtrymlivali placoŭki pryvatnyja, kali tolki jany byli polskija. I naadvarot, tyja-ž palaki ŭnikali i prosta bajkatavali takuju kooperacyju kredytovuju na sposab Raiffeisena i navat kooperacyju spažyvieckuju, bo jana była skrytym i sprytnym sposabam niemčańnia polskaha nasielnictva. Hety mament z zmahańnia paznanskich palakoŭ vielmi pavučalny dla nas biełarusaŭ imienna ŭ siahońniašni mament, kali kooperacyja na našych ziemlach što raz bolej tracić abličča kooperatyŭnaje, stanoviačysia vyraznaj ekspozyturaj vynaradaŭleńnia šyrokich narodnych masaŭ.

Nad sposabami, u jakija maje vylicca haspadarčaje žyćcio našaj vioski, *biaz škody* dla jaje z boku nacyjanalnaha i narodnaha, pracujuć ciapier biełaruskija praŭniki i ekanamisty. Rezultaty ichnaj pracy padadziom da viedama našych čytcčoŭ, jak tolki prajekt budzie apracavany. Pakul-ža sud dy dzieła i kab čas darahi nie marnavaŭsia darma, adklikajemsia da našych viaskovych pierad usim kulturnych pracaŭnikoŭ i da ŭsiaje śviedamaje biełaruskaje moładzi: —

v u č e c i e s i a!

Navuka — heta adzinaja reč, jakaja nihdzie nia zhubicca, jakuju nichto nie adbiare, nie ŭkradzie, nie zabaronić. Vučycca treba naahuł, kab pašyryć svoj razumovy kruhazor. Treba daskanalicca i ŭ vykonyvańni svaich štodziennych zaniatkaŭ: chto ziemlarob — musić być ziemlarobam dobrym! Nia majem svaich škoł, musim ich vynaharadzić sabie samaadukacyjaj.

Dziela ahulnaj navuki moža być razumna vykarystana kožnaja knižka i hazeta. Chto-ž cikavicca aśvietaj specyjalna ziemlarobskaj, musić čytać knižki ab ziemlarobstvie. Naša „Samapomač" moža być u hetym vielmi karysnym daradčykam. Asabliva karysnymi dla hetaj mety źjaŭlajucca hadaviki „Samapomačy," heta sapraŭdnaja kapalnia ŭsiakich radaŭ i viestak, karysnych dla kožnaha ziemlaroba. Aprača „Samapomačy" jość užo, choć nia šmat, u biełaruskaj literatury roznyja inšyja knižki, ab haspadarcy i ich treba nia tolki čytać, ale prosta vyvučyvacca i paśla ŭsio vyvučanaje pravodzić na dziele. Tady tolki navuka prynosie karyść.

Z usiej navukaj zviazany peŭnyja vydatki: na knižku, na hazetu. Jany kanieśnyja, choč niezraŭnana mienšyja i karyśniejšyja ad tych, jakija darma vykidajucca na roznych viečarynach. Vydatkaŭ na aśvietu i samaaśvietu škadavać nia možna, bo hety vydatak zaŭsiady varočajecca najmienš sam dziesiaty.

Dyk, biełaruskaja moładź, VUČYSIA!

R.

Dla samaadukacyi

radzim vykarystać nastupnyja bieł. knižki:

Cana

1. **Бр. Тарашкевіч:** Беларуская Граматыка 2.—
2. **У. Ігнатоўскі:** Кароткі нарыс Гісторыі Беларусі 2.25
3. **М. Гарэцкі:** Гісторыя бел. літэратуры 3.90
4. **А. Смоліч:** Географія Беларусі . . . 7.—
5. **Р. Віппэр:** Падручнік Новай Гісторыі. 1.50
6. **Р. Віппэр:** Падруч. Навейшай Гісторыі. 2.—
7. **Я. Купала:** Шляхам Жыцьця . . . . 5.—
8. **Я. Колас:** Сымон Музыка 2.50
9. **Я. Колас:** Новая Зямля . . . . . . 2.—
10. **Fr. Bahuševič:** Dudka Biełaruskaja i Smyk Biełaruski 1.50

Na ŭsie hetyja vydańni padpiščyki „Samapomačy" mohuć atrymać spusk 50 pracentaŭ (na pałovu).

Сельская гаспадарка.

Як перахоўваць бульбу.

Сёлетняе сухое лета мала дало пашы на сенажацях. Крыху больш шчордым было поле і мясцамі, як нас паведамляюць, ураджаі ярыны, асабліва бульбы, былі зусім здаваляючымі. Мусіць дзеля таго гаспадар наш сёлета шмат якую пашу замяніць бульбай і ёй выручацца. А дзеля таго, што бульба тады толькі можа быць цэлагодняй пашай, калі яе ўмела перахоўваць, мы тут над спосабамі перахаваньня бульбы пакрысе і затрымаемся.

Спосабаў на гэта ёсьць шмат. Кожны з іх аднак у аснове сваёй імкнецца да таго самага — стараецца як найдаўжэй ператрымаць бульбу падобнай да сьвежай. З гэтай мэтай: адны — перахоўваюць бульбу ў варывенных скляпох, іншыя — у ямах ці капцох паза варыўнямі і наагул паза будынкамі: пры ўсім гэтым вонкавы выгляд бульбы не зьмяняецца і вартасьць ейная, як пашы, зьмяншаецца толькі ад нявідомых зьменаў хэмічных. — Асобна ад гэтага стаіць спосаб перахоўваньня бульбы званы кішэньнем або марынаваньнем, пры каторым зьмяняецца ўжо ня толькі хэмічны склад перахоўванай бульбы, але і ейны вонкавы выгляд. Дзеля гэтага ўсе спосабы перахоўваньня бульбы з большага можна было-б падзяліць на дзьве асобныя групы: перахоўваньне бульбы з захаваньнем ейнага вонкавага натуральнага выгляду — назавём гэта перахоўваньнем **натуральным** — і перахоўваньне **кішонае**, пры каторым бульба свой вонкавы выгляд мяняе. Пераглядзім гэтыя спосабы папарадку.

Перахоўваньне бульбы натуральнае.

Заданьнем гэтага спосабу перахоўваньня ёсьць утрымаць якнайдаўжэй бульбу ў такім стане, каб яна як свомасьцямі, так выглядам была падобная да бульбы сьвежай. Трымаецца пры гэтым бульба ў варывенных скляпох ці ў надворных капцох. У паняцьці большасьці неабазнаных з справай людзей, найбольшай небясьпекай, якая пры гэтым пагражае бульбе, ёсьць мароз. Гэта аднак ня зусім так, бо перахоўванай гэтак бульбе ў роўнай меры пагражае і тэмпэратура надмерна высокая (ужо вышэй 10⁰Ц). Найлепшай тэмпэратурай пры перахоўваньні бульбы ёсьць 6 - 8⁰Ц: саладзее бульба ўжо пры тэмпэратуры 6⁰Ц, мерзьне пры —1⁰Ц, хоць цалком зьмярзае пры -3⁰Ц.

Першым варункам добрага перахоўваньня бульбы спосабам натуральны — у варывенных скляпох ці ў надворных ямах і капцох — ёсьць стараннае выбіраньне да перазімаваньня бульбы толькі зусім здаровай і цэлай, неабабітай. А пасьля, такая бульба мусіць быць ачышчанай ад гліны і зусім сухой.

Цяпер-жа час адабраць і бульбу да саджэньня.

Jak hadavać trusoŭ.

Ci treba hadavać trusoŭ? Trus (*lepus cuniculus*), inačaj zvany krolikam, maje šmat svomaściaŭ, dziela jakich šyroka pavinien-by być hadavanym u małaziamielnych asabliva haspadarkach, a tymbolš u biezziamielnych rabotnickich kalonijach. A heta dziela taho, što z trusa maje čałaviek zusim dobruju aŭčynku, dobraje miasa i moža mieć vielki dalikatnuju voŭnu. I ŭsio heta vielmi skora i blizu za darma, kali nia ličyć krychu pracy pry dahladzie. Trus jošć žyvinaj usiejadnaj i vielmi žyrkaj; dziela taho pry dahladzie za im, aprača ŭtrymańnia čystaty, hałoŭnuju ŭvahu treba źviarnuć na pryhatavańnie samoj pašy (kab nia była sapsutaj), i dapilnavańnie, kab trus pry kormie nie pierabraŭ miery. Ale ab hetym budzie mova jšče dalej.

Skul uzialisia trusy i padzieł ich na rasy. Trus siahońnia ŭ nas davoli viedamaja žyviolina, pašyranaja asabliva ŭ hałodnuju paru vajennuju i ciesnapaślavajennuju, a dastaŭsia jon da nas z paŭnočnaj Afryki, praz Hišpaniju i ŭsiu zachodniuju Eŭropu. Spačatku — u Aŭstralii žyvie hetak jašče i siahońnia — žyŭ trus dzika i chutka razmnažajučysia rabiŭ vialikija škody. Palavaŭ tady na trusa čałaviek dziela dźviuch pryčyn: raz, kab pazbycca dakučlivaha škodnika i dva, kab mieć dobry aŭčynny tavar. Na miasa trusoŭ spačatku nia ŭžyvali, a byli narody (žydy), u jakich spažyvańnie trusovaha miasa prosta było zabaroniena. Z časam adnak čałaviek trusa asvoiŭ, taksama pierad usim dziela jahonaj aŭčynki. Kali-ž asvojenaha trusa pačaŭ čałaviek hadavać z tej samaj uvahaj, jak i inšuju žyviołu, tady byli vyhadavany novyja hatunki trusoŭ, jakija aprača aŭčynki dajuć jašče šmat voŭny i dobraha miasa. Hetak paŭstała z časam vielmi mnoha ŭsialakich rasaŭ trusoŭ, z jakich adnak daloka nia ŭsie majuć hadaŭlanuju vartaść. Tyja-ž rasy, jakija hetu hadaŭlanuju vartaść majuć, možna z bolšaha padzialić na try vialikija hrupy: 1. hrupa trusoŭ aŭčynnych, 2. hrupa trusoŭ aŭčynna-miasnych i 3. hrupa trusoŭ miasnych. Asobna staić staraja rasa trusoŭ hetak zvanych **Anhorskich**, jakija dajuć dobruju voŭnu.

Празначаную да перахаваньня бульбу ня можна проста з поля ссыпаць у скляпы ці ямы, але перад усім трэба яе рассыпаць ценькім пластам у правеўным, ад дожджу забясьпечаным месцы (у гумне, вазоўні ці іншым падстрэшшы), даючы ёй гэтак час выдыхаць з сябе большую часьць непатрэбнай вогкасьці і газаў.

Варыменныя скляпы для бульбы мусяць быць сухія, старанна ачышчаныя ад усякіх астаткаў, а да таго—паскрапляныя вапенным малаком ці выкураныя серкай. Па ссыпаньні абсохшай бульбы ў такія скляпы, самую варыўню — у першыя асабліва пагоднія дні— трэба старанна ветраць. Затхласьць паветра ў варыўні трэба выветрываць і пасьля, памятаючы аднак, што надмернае ветраньне лішне пабуджае бульбу да дыханьня і ад гэтага бываюць немалыя страты. Аднак, пакуль тэмпэратура не абніжыцца да 4°С, вахонцы ў варыўні павінны быць паадчыненымі.

Пры найлепшых варунках бульба перахоўваная ў варывенных скляпох можа быць забясьпечанай ад большых страт толькі праз паўгоду часу. Да таго, пры большым ураджаі, на такое перахоўваньне патрэбна шмат месца і ў варыўні становіцца за цесна. Стасаваныя ў нас ямы на бульбу не заўсёды адпавядаюць вымогам гаспадаркі і таму далёка цікавейшымі зьяўляюцца гэтак званыя (з нямецка) к р э х т ы. Ёсьць гэта няглыбокія (найвыжэй 30 см.) падаўгаватыя равы. Прыгатаўляюцца яны гэтак:

У сухім, непрапускным, заслоненым прад паўночнымі вятрамі месцы выворываецца роў, углыбку да 30 см., ушырку да паўтара або і двух мэтраў і ўдоўжкі — колькі трэба, каб памясьціць бульбу, празначаную да перахаваньня. Уздоўж і пасярэдзіне гэтага крэхту (рава) укладаюцца на нізкіх (15—20см.) козьліках дошкі ці латы ў форме стрэшкі, па тое, каб зрабіць люхт, праз каторы сподам выветрывалася-б уложаная бульба. Пасьля насыпаецца сама бульба „коптарам,“ у форме вострай градкі, вышынёй 1.00—1.50 м. ад самага споду да грэбяня і на пачатак пакрываецца толькі роўным пластом чыстай саломы. З абодвух бакоў крэхту выкопваюцца па аднаму няглыбокаму раву, каторымі адцякае ад крэхту вада.

Калі ўжо пазімнее і крэхт з бакоў абкідаецца на пачатак ценькім толькі пластом зямлі, грэбень крэхту астаецца йшчэ вольным ад зямлі і на ім робіцца верхні люхт гэткім спосабам: уздоўж цэлага грэбяня кладзецца гладкая плаціна ці жэрдка і праз яе, ўпоперак, перакладаецца пласт доўгай саломы. Канцы гэтай саломы з абодвух бакоў абсыпаюцца зямлёй. Пасьля гэтага плаціна (жэрдка) выцягваецца, а на ейным месцы астаецца вольны люхт, каторым адходзіць з крэхту ўся пара і газы. Гэты люхт астаецца адчыненым аж да часу сільных маразоў і тады ён з абодвух бакоў запіхаецца саломай. Тое самае з люхтам споднім.

З настаньнем маразоў прысыпаецца пласт зямлі на крэхце да грубіні паўмэтра. Пласт сьнегу таксама бароніць крэхт ад марозу, а йшчэ лепш робіць гэта гной, каторага аднак ня можна раней накладаць — асабліва на грэбень—аж покуль не прамерзь-

Jak vybirać trusoŭ na plem. Udača hadoŭli trusoŭ zaleža pierad usim ad vybaru plemnaha materyjału, jaki musić być absalutna zdarovy, mieć viasioły, žyvy vyhlad, bliščustuju poŭść, nia śmieje być chudym, — bo heta najčaściejšaja aznaka chvaroby. Samiec da taho pavinien być mocna zbudavany, mieć šyrokuju hrudzinu, dobra raźvity kaściak i kruhłuju (kaciačuju) hałavu. Samka (truska) pavinna vykazvać „samčy“ typ (mienš hruby), kości miadničnyja pavinny być šyrokimi, a da taho plemnaja samka musić mieć najmienš 6 (šeść) sisiok. Chto haduje trusoŭ na toje, kab mieć dachod z ichnich aŭčynak, toj musić viedać, što najbolš chodkija aŭčynki biełyja, bo ich možna ŭsialak farbavać. Dobra ceniacca taksama aŭčynki sivyja, šeryja i naahuł adnakolernyja, nie rabyja.

Zapłodžyvańnie trusoŭ. Ahulna viedamaj jość vialikaja plemnaja siła trusa. Heta nia znača adnak, kab čałaviek mieŭ prava hetu zdolnaść nadužyvać. Miesiacy zimovyja treba pakinuć trusom (plemnym) na adpačynak, mienš karmić i nia trymać u ciopłych kletkach. Prypuskać samku da samca (a nie naadvarot) treba tolki pad viasnu, z tym, što zapłodnienaja samka akocicca praz 30—33 dni. Zvyčajna pakryvańnie samak adbyvajecca davoli lohka. Samka patrabujučaja samca paznajecca pa tym, što stanovicca raptam niespakojnaj, pałachlivaj, a radzilnyja orhany jejnyja čyrvaniejuć i braknuć. Hetak padražnienuju samku treba biezadkładna ŭsadzić u samcovu kletku i tut-ža pačakać, pakul toj *dvojčy* jaje pakryje. Biez dahladu złučanych pleminikaŭ pakidać nia možna.

Spačatku samka zvyčajna chvilinu-druhuju ŭciakaje, ale nie ahryzajecca i doŭha heta nia tryvaje. — Kali-ž zamiest haniacca pa kletcy samka siadzie ŭ kut zadam i zdradžaje namiery hryźcisia — znak heta, što jana samca pryniać nia choča; tady jaje treba nie čakajučy z kletki samcovaj vybrać, pasadzić nazad i sačyć, kali jana ŭznoŭ zapatrabuje samca.

Ale sačyć treba i samku, jakaja samca pryniała, bo i takaja nie zaŭsiady stajecca zapłodnienaj. Niezapłodnienaść pakrytaj samki paznajecca miž inšym pa tym, što takaja samka na 12-tym dni paśla pakryćcia pačynaje ŭžo rabić hetak zvanaje falšyvaje hniazdo: z padścilki i z svaje sobskaje poŭści, jakuju pačynaje vydzirać z brucha i z bakoŭ. Hetkaje-ž

не абсыпаная зямля блізу аж да самай бульбы.

Добра ўложаны і дагледжаны крэхт перахоўвае бульбу лепш, чым варывенны склеп. Адна толькі пры гэтым нявыгодна: ня можна бяз шкодаў выбраць бульбы з крэхту падчас марозу.

Кішэньне бульбы.

Гэты спосаб перахоўваньня бульбы, у параўнаньні з спосабамі папярэднімі, мае тую выгоду, што: 1. перахоўваная бульба займае найменш месца, 2. не вымагае, каб бульба была толькі зусім цэлай, нязьмерсшай і зусім здаровай, 3. добра закішаная бульба найменш дае стратаў і найдаўжэй — да двух гадоў — можа перахоўвацца. З другога ўзноў боку вымагае гэты спосаб вялікай акуратнасьці і крыху працы, як пры прыгатаваньні ямаў да кішэньня, так'і самой бульбы.

Істота кішэньня бульбы ў тым, каб забясьпечыць яе ад сапсуцьця пры помачы млечнага квасу, які вытвараецца ў парэзанай ці патоўчанай, цесна ўтаптанай (убітай) і старанна ад доступу паветра забясьпечанай бульбе. Кішонай можа быць бульба сырая або параная. Атрыманая гэтак кішонка з бульбы паранай, апрача іншых дадатніх свомасьцяў, можа быць добрай пашай ужо з ямы, тады як кішонка з бульбы сырой, прад тым як быць скормленай, павінна быць яшчэ зваранай. Для поўнасьці разгледзім аднак абодва спосабы — спачатку сыры, а пасьля параны.

Бульба празначаная да кішэньня спосабам **сырым** перад усім ачышчаецца ад пяску, з інадгніўшай вырэзваюцца сапсутыя мясцы і ўся пасьля дробна сячэцца. Пасечаная гэтак бульба ссыпаецца ў загадзя прыгатаваную яму. Яма павінна быць выкапана ў сухім, непрапускным грунце. Найлепш, калі можна гэткую яму выцэмэнтаваць. Пры недастатку аднак можна задаволіцца тым, што на дно накідаецца добрая гліна, умесіцца і выбрукуецца каменем. Сьцены абкладаюцца дошкамі. Яма павінна быць паўтара аж два мэтры глыбокая, наагул аднак такая, каб закішаную ў ёй бульбу можна было скарміць праз тры тыдні. У гэтак прыгатаваную яму сыплецца парэзаная бульба пластамі па 25—30 см. і старанна ўтоптываецца (гэта вельмі важна!), найлепш нагамі абутымі ў „драўлянікі". Дзеля таго, што сырая бульба пры сьцісканьні выдзяляе з сябе шмат соку, добра бывае яе перамешваць мякінай ці проста сечкай і так разам убіваць. У кожным разе ня можна дапускаць да таго, каб на версе стаяла бульбяная жыжка і калі б яна ўсё-ж наверх выбівалася, дык трэба перастаць далей накладаць і пакінуць праз ноч у супакою, каб упілася.

Калі ўжо яма поўная, прыкрываецца ня грубым пластам мякіны, на каторую даецца пласт добра вымешанай гліны. Гэтай глінай павінен быць замкнёны ўсякі доступ у яму для вонкавага паветра. На гліну даецца пасьля грубшы (каля 70 см.) пласт зямлі. Чым грубшы, тым лепшы. Калі-б з часам у гэткай пакрыве ўтварыліся шчэрбіны, дык іх трэба зараз жа замазываць вымешанай глінай. — Над усім даецца йшчэ звычайная саламяная стрэшка, якая найлепш забясьпечвае ад пра-

---

hniazdo *sapraŭdnaje* robić zapłodnienaja truska tolki na paru dzion pierad radami.

Kali-b nanova prypuščanaja truska astałasia taksama niezapłodnienaj, dyk heta znak, što jana abo naahuł chvoraja, abo tolki časova asłablenaja. Ahulnuju chvoraść napravić nia lohka, ale pabudzić achvotu da pryniaćcia samca možna kormam; dajecca tady trusom: avios, seler, piatruška, krop. Dobryja vyniki daje taksama pamiaščeńnie samca i samki ŭ sumiežnych z saboj kletkach. Usio heta adnosicca jak da samca, tak i da samki. Samiec apračа taho moža stracić achvotu da skoku, kali jon pieramučany, kali musić absłuhoŭvać bolš jak 10—12 samak. Ličby hetaj nia možna nikoli pieravyžšać.

Trusianiaty pry matcy. Rodzić truska zvyčajna šmat dziaciej, ale pakidać hadavać možna tolki hetulki, kolki matka maje sisiok; reštu treba abo dadać u inšaje hniazdo (prad tym adnak dobra vycieršy poŭściu novaj „mamki"), abo navat kotcy ci ŭreščie słabiejšych trusianiat patapić. Tut-ža zrazu adnak z usim nacis-kam treba zaznačyć, što trusy vielmi nia lubiać, kab niechta, a pieradusim čałaviek, padhladaŭ u ichniaje hniazdo. Niekatoryja hadaŭcy navat ćvierdziać, što kali truska zrazumieje, što čałaviek padhladzieŭ jejnych dziaciej, dyk hatova ich pajeści, bo pierakanana, byccam, što čałaviek jejnyja dzieci adbiare. Ci heta aściarožnaść truski jdzie tak daloka — heta jšče z całaj pełnaściu nia ščvierdžana. Viedama tolki, što ludzkoje voka ŭ pieršych dvuch tydniach paśla taho jak truska akocicca, biez patreby jaje niepakoje i dražnić. Dziela taho čałaviek nie pavinien biez patreby ŭ hniazdo zahladać. Na toj-ža vypadak, kali hetaha kaniešna treba, jak napr. na toje, kab pierakanacca jak silnaje hniazdo, trusku-matku treba pieradusim vybrać z hniazda, adnieści ŭ zakrytaje miesca i paśla tolki aściarožna rabić svaju rabotu. A zrabiŭšy treba ŭznoŭ usio tak pakinuć, jak było.

Rodziacca trusy hołymi, ślapymi i naahuł słabymi, vielmi patrabujučymi čułaj apieki, a pieradusim dobraha kormu. Ci taki mały trus dobra nakormleny, ci jon hałodny, paznajecca pa tym, ci jon poŭny, ci jahonaje bruška parožnaje i skura na im pamorščanaja. Važna tut, kab truska-matka mieła dosyć małaka. Dziela hetaha radziać karmić truski ŭ hetu paru takimi małakahonnymi pašami, jak

цяканьня вады, каб не дапусьціць яе да схаванай бульбы.

Дзе ёсьць магчымасьць парыць бульбу, там заўсяды лепш даваць да кішэньня бульбу спараную; не на кашу, а толькі каб была мягкай. Адзіны гэта спосаб выкарыстаць бульбу захваченую марозам. Кішэньне запаранай бульбы мае йшчэ і тую выгоду, што дае і лепшую пашу, менш стратаў, ня траціцца бульбяны сок, даўжэй трывае і не вымагае так дакладнага прыгатаваньня ямы: добра ўдаецца ў звычайнай яме ў непрапускной зямлі, з брукаваным дном і ашалляванымі сьценамі.


У прыгатаваную яму накладаецца стоўчаная бульба і дакладна ўбіваецца. Поўная яма прыкрываецца таксама спачатку ценькім пластом мякіны, пасьля замазваецца глінай і наверх прысыпаецца зямлёй.—Мясцамі накладаюць у адну яму параную бульбу разам з сырой у перамешку, або пластамі.

Заўсяды варункам добрага пeратрыманьня кішонай бульбы ёсьць старannae ўбіцьцё і наагул недаступнасьць вольнага паветра.

100 мэтр. цэнтнараў (у адным мэтр. цэнтнары 6 пудоў і 10 фунт.) паранай бульбы наложанай у яму і дакладна зьбітай займае прастору ня больш 1 куб. мэтра (мэтр удожкі×ўшыркі×ўвышкі).

Аб застасаваньні кішонай бульбы як пашы—наступным разам.

А. К.



На сенажацях увосені.

Дагляд за полем, за жывёлай па нашых гаспадарках сьведама, ці нясьведама—павялічваецца. Адны толькі сенажаці чамусьці ўсьцяж не знаходзяць зразуменьня і іх бачыць чалавек наш найчасьцей толькі тады, калі хоча касіць. А сенажаці-ж кіруюцца тымі самымі законамі, што і поле: родзяць толькі датуль, пакуль з іх ня вычэрпаюцца запасы спажыўных сучастак. Запасы гэтыя на палёх абнаўляюцца гнаеньнем, а хто-ж у нас падумаў, каб сенажаць ды пагнаіць, або прынамся ў час зраўнаць, асушыць, разбаранаваць? Восень на гэта ёсьць найадпаведнейшай парой.

Там, дзе сенажаць ня ёсьць пасьбішчам, зараз жа пасьля атавы трэба яе разбаранаваць, а гэтым самым памагчы закараніцца на наступны год. Зарост травы, які да зімы не закусьціцца і не набера досыць спажыўных запасаў, на другі год не пасьпее ўжо разьвіцца. Іншымі славамі, **сенажаць жыве тым, што назьбірае ўвосень году папярэдняга.**

Гэта. маючы на ўвеце трэба ўжо раньняй восеняй упарадкаваць сенажаці, выбаранаваць мох, пазразаць купіны і кусты, прачысьціць старыя і выкапаць новыя равы, зраўнаць, разбаранаваць і... пагнаіць.

З натуральных гнаёў на сенажаці найлейшы кампост, выраблены ў гаспадарцы з розных адпадкаў. Кампост растрасаецца роўна па сенажаці і гэтак пакідаецца праз зіму. За гэты час усё найлепшае з кампосту ўпіваецца ў сенажаць, а рэшткі на вясну

karaviačaje małako, cukrovyja i karmovyja buraki, morchva i im pad. — Horš byvaje, kali truska nia choča dziela niejkich pryčyn svaich dziaciej saić naahuł, što zdarajecca časam asabliva ŭ maładych trusak. U takim razie nie astajecca ničoha inšaha, jak uziać žmieniaj trusku za chrybiot i prytrymać nad hniazdom, kab dzieci mahli ŭčapicca i ssać. Časta heta pamahaje i truska, pačuŭšy jak adciahvanaje ssańniem małako ablahčaje napružańnie ŭ hrudzioch, dalej užo soje dziaciej achvotna sama. Kali-b adnak sama truska i dalej jašče z sajeńniem nie śpiašałasia, dyk praz 8—10 hadzin treba takoje zmušanaje sajeńnie paŭtaryć.

Adłučańnie trusianiat. Praz 2 tydni paśla naradžeńnia pačynajuć užo maładyja trusianiaty pakrysie vybirać drabniejšaje siena, maładuju travu, avios, vyhryzajučy hety apošni z łuski tak umieła, što bližej nie pryhladajučysia zdajecca avios taki zusim niakranutym. U hetu paru trusianiaty, a ŭłaściva — ichniaja matka „nie bajacca“ ŭžo ludzkoha voka i zvyčajna žyva pierahaniajucca pa kletcy, patrabujučy hetak bolš prastoru. Dziela hetaha treba rabić dla samak takija hniozdy, kab ich možna było ŭ hetu paru pabolšyć. U takim hniaździe pavinna być taksama takoje miesca, kudy nie mahła-b dastacca matka, a kudy mahli-b svabodna pierałazić trusianiaty i jeśći padadzieny im smačniejšy korm, napr. avios.

Adłučajucca maładyja trusy ad matki jak užo majuć pa 6—7 tydniaŭ žyćcia. Sumlenny hadavielnik pakidaje paśla hetaha samak trusovych volna jašče praz 10—14 dzion i tady tolki prypuskaje ich da samca. Ahułam biaručy, u hod truska pavinna radzić nia bolš jak 3—4 razy. Adstaŭlenyja trusianiaty mohuć žyć razam, samcy i samki, bolš-mienš praz čatyry miesiacy. Paźniej hetaha času maładych samcoŭ treba adłučyć i pamiaścić kožnaha asobna, bo ŭ hetu paru jany pačynajuć užo płociava daśpiavać i hryźcisia, uzajemna kalečačysia i psujučy sabie aŭčynku — Truski maładyja mohuć astavacca razam až da času pakul nie pražyvuć — mienšyja rasy prynamsia 8 miesiacaŭ, a bolšyja — 10 až 12 miesiacaŭ. Raniej hetaj pary pakryvać nia možna, bo choć truska pry dobrym dahladzie płocieva daśpieje i raniej (zapatrabuje samca), to adnak cialesna prad 8—12 miesiacami jana jašče byvaje niedaśpiełaj i pradčasnaja ciahotnaść moža joj vielmi zaškodzić. Tut ža treba zaznačyć, što šmatlikija chvaroby i h. zv. zbačeńni

чыста зграбаюцца. Вельмі цэнным гноем ёсьць і попел з дрэва, рассеены ў разбаранаваную сенажаць і — па магчымасьці — прыкрыты.

З штучных гнаёў — каму толькі зварот на гэта пазволіць — найлепшым бадай ёсьць тамасшляк (фосфар) і каініт (паташ). На сенажаці ніколі нягноеныя даецца ў першым годзе аж 10 мяшкоў (па 100 кілё кожны) каініту і 7 мяшкоў тамасшляку на гэктар. Тамасшляк і каініт можна цесна прад высевам мяшаць і высейваць за раз; пакідаць аднак мешанку нявысееную ня можна — сапсуецца. У наступных гадох даецца што другі год па 5 мяшкоў каініту і што трычатыры гады па паўтара мяшка тамасшляку на га. Прад кожным засевам гнаёў трэба разы два праехаць накрыж вострай бараной, каб зьдзёрці мох і даць вольны доступ паветру да карэньняў травы.

З цэлай пэўнасьцю можна сказаць, што догляд і ўгнаеньне сенажацяў сягоньня часта значна лепш аплачваецца, чымся такі-ж догляд за полем аромым. Толькі адзін варунак: сенажаць прад гнаеньнем мусіць мець урэгуляваную вогкасьць. Мокрая сенажаць прад угнаеньнем павінна быць асушана, а сухая — заліта. Інакш шкада працы і коштаў.

В. В.



Як даіць каровы.

Умелае даеньне каровы — гэта вельмі важная рэч у малочнай гаспадарцы, бо само яно ўжо збольшуе колькасьць малака, робіць яго клусьцейшым, папраўляе спраўнасьць малочных гручолаў і наагул усей малочнай жывёлы. Нашы людзі ў большасьці замала або і зусім ня цікавяцца гэтым пытаньнем і таму паносяць вялікія страты.

На чым жа палягае добрае даеньне кароў?

Трэба ведаць, што найважнейшай ёсьць рэчай, каб здоіваць карову да апошняй каплі малака. З гэтага маем патройную карысьць: першая — малака атрымоўваецца наагул больш; другая — гэта малако клусьцейшае, бо самыя апошнія каплі малака маюць у сабе найбольш туку (клустасьці) і таму яны, як сьмятана (у гаршку), найвышэй у вым'і зьбіраюцца (састаіваюцца) і пры самым канцы выдойваюцца. Малако з пачатку даеньня мае ўсяго каля 1.5 проц. туку, а пры самым канцы гэты працэнт падымаецца аж да 12. Трэцяя карысьць тая, што карова раздойваецца, бо — як сказана — папраўляюцца малочныя гручолы, якія, добра выдаеныя, дадуць больш малака пры наступным даеньні. І наадварот, вым'я раз добра неапарожненае псуецца і адвыкае ад правідловае дзейнасьці.

Каб добра выдаіць карову, на гэта трэба спосабу і сілы. У нас сядзе жанчына пад карову і тыцкае двума пальцамі, яшчэ і мачае іх раз-за-разам у малацэ, аж гідка глядзець. Лепш даіць цэлая далоняй; знача,

natury, časta spatykanyja siarod trusoŭ, majuć pryčynu ŭ pradčasnym zapłodžyvańni, tymbolš kali płodziacca štuki blizkija da siabie pa kryvi (pasvajačanyja). Na heta treba źviarnuć asablivuju ŭvahu.

Čym i jak karmić trusoŭ. Skazana było ŭžo, što trusy jaduć usio i što jany vielmi žyrkija. Heta nia znača adnak, što trusu možna davać usio, što papała, bo niekatoryja pašy — a ich jość nia mała — trusom vielmi škodziać. Da takich škodnych pašaŭ naležać miž inšym: voŭčaje łyka, voŭčaja jahada, maki, zialonyja hrečka i šalbabon (fasola), sałata, kukol, syraja bulba; škodziać trusu liścio višni, čarešni, ślivy, nia lubiać listoŭ topalu. Škodzić trusom, kali źjaduć šmat mokraj kaniušyny abo takoha-ž kapuścianaha liścia. Lubić-ža trus: liścio i hałuzki biarozy, lipy, asiny, klonu, dubu, laščyny, rabiny i navat jołki. Morchva i buraki karmovyja, bručka, repa i varanaja bulba — heta lubimaja paša trusa. Ale pry ŭsim hetym nia možna zabyvacca, što kali niechta dumaje mieć dachod z trusoŭ, dyk musić mieć dla ich dobraje siena, a na abmiešku: votruby, hrečynu, žałudy, lnianoje siemia, makuchi, avios (asabliva dla małady(ch), jačmień pšanicu.

Karmić trusoŭ treba prynamsi dvojčy na dzień, pry čym ranicaj dajecca jamu paša bolš ci mienš vadzianistaja, napr. buraki, morchva (asabliva dla maładych i rasovych trusoŭ), bulba, usialakaja kišonka i h. d., a ŭviečary— suchaja, napr. avios, siena. Viečaram taksama treba trusom dadavać i sol, katoruju jany vielmi lubiać i šmat patrabujuć: na štuku darosłuju ŭ dzień — 2 gramy. Druhoj asablivaściaj trusa jość toje, što jon lubić u damiešcy da pašy horkija dadatki, jak napr. pałyn, listy chrenu, dzikoj cykoryi; taksama i sušanaja krapiva. Z hetaje pryčyny radziać źbirać krapivu za zialona, viazać jaje ŭ nievialikija pučki i sušyć na zimu ŭ suchim, pravieŭnym miescy. Taksama pryhataŭlajecca zahatoŭka i sučkoŭ (halinak) vierby.

Kišonki dla trusoŭ pryhataŭlajucca hetak: kapuścianyja listy, bulbianaja nać, roznyja sarniaki (pustazielle), rubajucca i składajucca, jak kapusta ŭ boćcy, płastami, solacca i staranna ŭbivajucca; paśla prykryvajucca denkam i pryciskajucca kamieniem. Praz 6—8 tydniaŭ kišonka hatova. Dajecca jana krolikam hatavanaja. Buraki, bručka, repa dajucca trusom u stanie śviežym, abo jak kišonka.

сіська (дойка) абымаецца пры самым вым'і вялікім і паказальным пальцамі, а рэштай пальцаў перабіраецца па чарзе, зьверху ўніз (як іграючы на жалейцы) і выціскаецца малако на вонкі.—Другая рэч, якую робіцца — гэта масажаваньне вым'я; значыць прад даеньнем вым'я гладзіцца і як яно крыху са грэецца і зробіцца тугім — лёгка націскаецца. Тады наступае даеньне, пры чым сядаць трэба з правага боку каровы і апёрціся галавой аб каровін жывот. Калі малако перастане ўжо выдзяляцца, масажуем вым'я другі раз, не пакідаючы пры гэтым сісёк, але падкідаючы вым'я рукамі ўверх, падобна, як гэта робіць цялё ссучы тую ж карову; тое самае робіцца з другімі чвэрткамі вым'я, пасьля гладзіцца цэлае вым'я з гары ўдол і доіцца далей. Ад гэтага карова йшчэ прыдасьць малака і гэта вельмі добра ўплывае на яе малочнасьць.

Даіць трэба насамперш абедзьве пярэднія сіські, а пасьля абедзьве заднія. Добра выдаіць карову, ды яшчэ некалькі — гэта работа даволі цяжкая і таму у прыкладных гаспадарках выконваюць яе не жанчыны, а мужчыны.

Далей, як падчас даеньня, так і пасьля трэба абхадзіцца з каровай лагодна; карова, якую б'юць ці штоўхаюць, становіцца пужлівай, неспакойнай і тады яна ані выдзяляе, ані выпускае малака. Ня менш важнай рэчай ёсьць не даваць карове нічога есьці падчас даеньня, бо калі яна ў гэту пару есьць, а йшчэ баіцца, каб другая ад яе не адабрала, дык кепска аддае малако. Трэба ад самага пачатку п р ы в у ч ы ц ь карову, што яна дастане належную ёй пашу толькі па скончаным даеньні. Далей, трэба ўважаць, каб даіць карову ўсё ў тым самым часе, найлепш а гадзіне 5-ай рана, 12-ай упалудзень і 7-ай вечарам. Частае выдойваньне падносіць малочнасьць, але часьцей як тры разы ў дзень даіць не аплачваецца.

(*„Сіль. Госп.“*.) **інж. Р. Я.**

Аб ськіваньні.

Маем пры гэтым на ўвеце перад усім ськіваньне ў кароў. Разумеецца-ж пад гэтым словам прадчаснае ацяленьне, найчасьцей паміж 5 і 8-ым месяцам.

Усякае ськіваньне гэта для гаспадара страта. Прычыны ськіваньня бываюць або выпадковыя, вонкавыя, або заразныя. У гэтым апошнім выпадку ськіваньне паўтараецца ў даным хляве некалькі разоў і то не ў аднэй штукі, а ў некалькіх.

Выпадковыя прычыны ськіваньня гэта найчасьцей мэханічныя, як усякія удары на жывот, неўласьціваe кармленьне (сапсутай пашай або калі да пашы дамешаны напр. жытнія спарышы ці іншыя труючыя расьціны) або хворасьць радзільных ворганаў маткі.

Прычынай заразьлівага ськіваньня ёсьць асаблівы дробнатвор (бактэрыя), зародкі якога размнажаюцца перад усім у гніючых астатках ськіваючых кароў. Гэтыя астаткі (радзільныя логвы) ў такой жывёлы ніколі ня выходзяць чыста навонкі, але часьць іх астаецца ўсярэдзіне і гніе. З цела зародкі гэтыя дастаюцца ў гной, размнажаюцца і калі стуль дастануцца на вонкавыя радзільныя ворганы іншых цельных кароў ці іншай жывёлы, дык іх заражаюць і гэта жывёла таксама ўжо ськівае.

У першых месяцах цельнасьці ськіваньне адбываецца лёгка і скора. У пятым і дальшых месяцах, калі плод ўжо бывае большым, ськіваньне становіцца падобным да праўдзівага цяленьня. Толькі па такім ськіваньні лагво астаецца ўсярэдзіне і далей плодзіць заразныя бактэрыі. Ад гэтага настаюць усякія катары радзільных ворганаў, якія даводзяць да поўнай няплоднасьці, жывёла худзее і дойнасьць яе абніжаецца, а падчас і зусім занікае.

Лячэньне пачатага ўжо ськіваньня нічога не памагае. Тым большае значэньне мае асьцярожнасьць прад гэтай хваробай, асабліва прад ськіваньнем заразьлівым. Сьцерагчы трэба цельныя каровы, каб яны аб што небудзь ня ўдарыліся, ня можна паіць іх лішне сьцюдзёнай вадой, ані карміць сапсаванай, заплесьнеўшай пашай. Проці заразьлівага ськіваньня найлепшым лекам ёсьць чыстата і частая дэзынфэкцыя хлявоў; абавязкава чыста трэба прыбіраць усялякія астаткі лагва па цяленьні і часта, па магчымасьці штодзень абмываць вонкавыя радзільныя ворганы ц е л ь н ы х кароў дезынфэкцыйнымі сродкамі (найлепшым з іх бадай ёсьць 0. 1% раствор сублімату — рэд.). Аднак пры масавым заразным ськіваньні можа памагчы толькі лекар-вэтэрынар.

Д-р Ю. З.



Пчаляру ў м-цы кастрычніку.

Не пара ўжо пераглядаць пчолы, але калі нехта да гэтага бывае змушаны, хай гэта робіць асьцярожна раніцай або ўвечары. Лёткі павінны быць звужаны, каб пчолы маглі бараніцца прад зладзейкамі — пчоламі і асабліва прад мышамі, якія цяпер шукаюць ужо цяплейшага кутка, каб пераначаваць, а калі пчаляр не агледзіцца, дык і зазімаваць. Найважнейшай аднак справай ёсьць абгледзіць вуль прад халадамі, забясьпечваючы яму адначасна дастатак сьвежага, сухога паветра, якое патрэбна пчолам ня менш як корм. З двух лётак, адна (вышэйшая) астаецца праз зіму адчыненай, хоць і звужанай.

Што датыча забесьпячэньня ад холаду, дык трэба з усей пэўнасьцю зацеміць, што на колькі пчолы баяцца зімна, на толькі шкодна ім і празьмернае цяпло. Тут патрэбна залатая сярэдзіна. Зацёплае зазімаваньне, пры не завострай зіме, змушае пчолаў да прадчаснага пладаваньня, а тым самым і да непатрэбнага вытрачваньня энэргіі. Калі-ж пасьля раптам настане зімно і пчолы ня могуць вылецець у аблёт, дык хварэюць на нястраўнасьць. Цяплейшага зазімаваньня вымагаюць толькі слабейшыя. Старанна трэба абгледзіць, ці няма якіх шчэлін у вульлі, або ці ня крэтаецца нейдзе ў дошцы сук, каторы пасьля можа вываліцца і ў вульлі паўстане шкодны працяг (скразьняк).

У вульлёх амэрыканскіх паміж перагародак і сьценак даюцца бакавыя маты, якія мусяць шчыльна прымыкаць да сьценак вульля. На столь даецца саламяная мата і некалькі аркушоў газэтнай паперы нядрукаванай. Можна таксама з столі павыбіраць дошкі і замест іх паўстаўляць адумысловыя падушкі, выпаўненыя сечкай, мохам, ватай ці іншым матэрыялам, які глытае выдзеляную ў вульлі вогкасьць. Калі няма ані матаў, ані падушак, кладуць тады на столь некалькі аркушоў газэтнай паперы, а на яе — сена, салому і пасьля шчыльна прыкрываюць стрэшкай.

Гэта ўсё была мова аб вульлёх футраваных. Вульлі летнія, робленыя з паадзіночнай дошкі і маючыя зімаваць на дворы, павінны йшчэ апрача таго быць забясьпечаны і з надворку ад маразоў. Калі такіх вульлёў ня шмат, тады кожны з іх паасобку абвіваецца саломай на 4 цалі; вольнай пакідаецца толькі лётка. Калі-ж на пасецы ёсьць некалькі, а тым больш шмат такіх вульлёў, дык іх зносяць у адно месца, састаўляючы ў два рады — лёткамі да сярэдзіны — і ўсе за раз абкладаюцца саломай, ці нечым іншым, падобным, і абвязваюцца.

Хто мае для сваіх пчол вулёўню — там усе гэтыя захады лішнія.

Прыгатаваньне пчол да зімаваньня — для практычнага пчаляра рэч зусім лёгкая, але для пачынаючага вельмі клапатлівая. Меркай умеласьці прыгатаваньня пчол на зіму ёсьць правіла, што калі хто на 100 вульлёў змарнуе праз зіму 5 вульлёў, той ужо благі пчаляр, а хто змарнуе 10 вульлёў, той зусім не павінен звацца пчаляром. Дык трэба аб гэтым памятаць. **В. Ш—к.**

Як квасіць капусту.

Чым далей, тым болей пачынаюць людзі пераконывацца аб важнасьці для здароўя чалавека ўсякай садовіны і варыва, а перадусім — капусты. Асабліва важнай ёсьць у гаспадарцы — і наагул у сям'і — капуста добра заквашаная.

Якасьць квашанай капусты залежыць: 1. ад гатунку самай капусты, 2. ад якасьці бочкі, у каторай капуста заквашываецца 3. ад умелай працы пры заквашываньні капусты і 4. ад спосабу трыманьня заквашанай капусты. Застановімся-ж тут коратка над усім па чарзе.

1. Капуста выбраная да квашэньня мусіць быць салодкай, мусіць мець у сабе пэўную колькасьць цукру, каторым кормяцца бактэрыі малочнага квашэньня. А на прысутнасьці і магутным разьвіцьці гэтых бактэрыяў, як і самага малочнага квашэньня, гаспадыні мусіць вельмі залежыць, бо ня што іншае, як гэта імення квашэньне консэрвуе заквашаную капусту і робіць яе ня толькі смачнай і пахучай, але і вельмі здаровай. І калі-б з нейкіх прычын малочнае квашэньне прыпынілася, дык наступае квашэньне ацтовае, якое псуе ўсю справу беспаваротна. Дзеля гэтага, калі-б быў сумліў, што капуста браная да заквашываньня мае замала цукру, дык ей трэба гэтага цукру дадаць, дасыпаць, або хоць-бы даліць добрага квасмага малака, ці ўрэшце самай толькі сыраваткі.

2. Другой важнай справай ёсьць выбар бочкі для самага квашэньня. Такая бочка мусіць быць бязумоўна чыстай і па магчымасьці н о в а й. А гэта дзеля таго, што ў бочцы, у каторай ужо нешта было, звычайна ўжо сядзяць моцна загнязьдзіўшыся бактэрыі ацтовага квашэньня і не пазволяюць разьвіцца квашэньню малочнаму і ягоным бактэрыям.

Дзеля гэтага да квашэньня капусты найлепш ужываць новых бочак і толькі калі-б ужо іх сапраўды ня можна было чамусьці мець, прыходзіцца браць бочкі ўжываныя (але не старыя!) і іх адпаведна да квашэньня прыгатаваць. Робіцца гэта так: насамперш такія бочкі мусяць быць з пяском добра вышараваныя, асабліва каля пазоў. Пасьля такая бочка вымочываецца так доўга, аж пакуль выліваная кожных 12 гадзін вада будзе сусім чыстая і ня будзе мець аніякага запаху. Вымачаную бочку трэба выпарываць і яна тады ўжо гатова да ўжытку.

З новымі бочкамі трэба паступаць падобна, толькі што ў іх гэта праца робіцца хутка і лёгка.

3. Далей ідзе прыгатаваньне капусты і самае накладаньне яе. Поступ працы больш менш гэтакі: выбраныя да квашэньня галоўкі капусты, цьвёрдыя і здаровыя, перад усім „беляцца," г. зн. складаюцца на таку ў гумне, або ў іншым мейсцы, на вялікую грамаду і накрываюцца посьцелкай, мяхамі, або саломай (чыстай і здаровай!) і ляжаць так з тыдзень часу. Пасьля зложаная капуста адкрываецца, старанна ачышчаецца, адразаюцца качаны, самі галоўкі разразаюцца на палавіну і шаткуюцца.

Шаткаваць трэба капусту прад самым налажэньнем яе ў бочку. На дно бочкі кладуцца чыстыя, цэлыя капусьцяныя лісты і на іх ужо насыпаецца капуста шаткаваная, перасыпаецца сольлю, а хто любіць — і кмінам. На кожныя 10 клгр. (25 фунтаў) шаткаванай капусты сыпіцца 10 дэка (1/4 фунта) солі. Гэтак насыпаная пластамі капуста старанна ўбіваецца шырокімі таўчкамі так доўга, аж пакуль з капусты ня выступіць собскі ейны сок.

Калі бочка ўжо запоўнена д о б р а ў б і т а й шаткаванай капустай да самага верху, тады на шаткаваную капусту кладуцца ўзноў вялікія цэлыя лісты капусты, на іх — кавалак грубой, але чыстай і нефарбаванай (белай) тканіны (зрэбніны) і на яе — ч ы с т а е, г. зв. фальшывае дно (добра да сябе прылягаючыя і ўвесь верх зложанай капусты прыкрываючыя дошкі). Гэта дно націскаецца чыстымі каменьнямі, агульны цяжар каторых спачатку не патрабуе быць лішне вялікім.

Выступаючую вышэй фальшывага дна капусьцяную ваду трэба зьліваць як падчас самога квашэньня капусты, так і пасьля, калі капуста ўжо квасная. Заўсёды аднак крыха такой вады над капустаю быць мусіць.

Прыгатаваная да квашэньня бочка з капустай стаўляецца ў чыстае, нямаючае ніякага запаху памяшчэньне. Тэмпэратура ў такім памяшчэньні мусіць быць даволі высокая, бо аж 18—20°C (тэмпэратура цёплай хаты).

4. Па сканчаньні квашэньня бочка з капустай пераносіцца ў памяшчэньне цёмнае і зімное, а на фальшывае дно дадаецца больш каменьняў.

(З *„Ziemlarobskaj Čytanki"* *č. I.* *А. Клімовіча бач. 79*).

Не дачакаешся часопісі большай, пакуль складкамі сваімі ня ўтрымаеш часопісі меншай.

Сягоньня йшчэ вышлі падпіску на адзіную беларускую гаспадарчую часопісь «САМАПОМАЧ»!

Што рабіць з памідорамі.

З памідораў можна рабіць вельмі шмат і рознароднай стравы. Толькі да большасьці з іх патрэбны дадаткі, якіх ня можа даць сялянская гаспадарка. А яшчэ часьцей самі памідоры служаць дадаткам да такіх страў, якія ў сялянскіх варунках спаткаць можна ня часта. З гэтай вось прычыны памінаем тут усе тыя рацэпты, якія ў сялянскіх варунках выканаць ня можна, а прынамся — выканаць трудна, і агранічымся да некалькіх толькі найпрасьцейшых.

Успомніць-жа тут мусім перад усім аб такіх прыправах, як:

Салата з памідораў. Сьпелыя памідоры крояцца на кавалкі, дадаецца соль, перац, цыбуля, хто любіць — сьмятана, або крыха воцту і алівы. Такая мешанка называецца „салатай" і есца, як закуска, з хлебам і бульбай. Таксама даецца такая салата і да мяса.

Зупа з памідораў. Некалькі сьпелых памідораў наліваецца зімной вадой, кладзецца да гэтага пара морхавак, пятрушку, цыбульку і ўсё разам гатуецца. Пасьля гэты навар цэдзіцца, а памідоры добра расьціраюцца на гэтак званым друшляку, або праз сітца. У працэджаны навар кладзецца асобна згатаваны рыж або шальбабон (фасоля) ці якія іншыя крупы і гатуецца. На патэльні робіцца румяная засмажка з масла або з сала і ўліваецца ў гаршчок. Для смаку дадаецца йшчэ сьмятана.

Сос з памідораў. Угатаваць пару памідораў, перацёрці праз сітца і дадаць да загадзя зробленай засмажкі з мукі, масла або сала (сланіны) з цыбулькай, разьвясьці ўгатаваным расолам або вадой, дадаць крыху сьмятаны і загатаваць. Гэткім сосам запраўляюцца розныя кашы.

Як прыправа, дадаюцца памідоры да капусты, да галубцоў і да бурачкоў. **Ц.**

Як гаспадарыць чэская гаспадыня на вёсцы?

Калі сучасны гаспадарчы крызыс мы, гаспадыні, пачулі найбольш балюча, прычына гэтага ў тым, што выдаткі нашы, пры меншых даходах, не зьмяншаюцца, а павялічваюцца, перад усім на патрэбы хатнія, і нават на яду. Маладым гаспадыням гэта хлопат не малы. Але мы, што перажылі сусьветную вайну, калі досыць было купіць крыху солі, а ўсё рэшта трэба было дастаць з хаты, павінны патрапіць і сягоньня варыць выключна ўсё з нашых хатніх вырабаў, і то варыць танна і смачна.

У маей кухні ўсё прыгатаўляецца з свае гаспадаркі. Малако, масла, сьмятана, хлеб, мука, проса, мак, сала, усё сваё собскае, непрайшоўшае праз кірмашныя будкі... і ніколі ніхто не наракае, што не наеўся...

Як-жа прыблізна выглядае мой стол, магу вам расказаць. Раніцай на сьнеданьне кожны мае на выбар сьвежае малако, варанае малако або белую каву, да гэтага хлеб або кусок булкі з мінулага дня. Чорнай кавы ніколі не даю, бо ўжываю выключна наша пражанае жыта, ячмень або пшаніцу з малым дадаткам кавы запраўднай з зярнят і цыкорыі. У час цяжкай працы, хлеб да кавы мажыцца маслам. А дзевятай гадзіне, калі працуем у хаце (не на полі), кожнаму даю кавалак хлеба з маслам, з гусіным ці сьвінным салам, іншы раз кавалак сланіны або яйко, калі таннае. Жанчыны любяць у гэту пару кавалак хлеба з мармэлядай, мёдам ці з белай кавай, што асталася ад раніцы. У рабочы час гэта другое сьнеданьне раблю мацнейшым: даю яечніцу і па малой шклянцы віна з садовых пладоў. Алькаголю ня купляю. У палудзень даю розныя зупы, часам мясныя, іншы раз малочныя, грыбныя, бульбяныя, хлебныя. Каб былі гусьцейшымі, дадаю крупы з проса, пансак, гарох, шальбабон, бульбу і інш., усё з собскае гаспадаркі.

Мяса ў земляроба ніколі шмат няма... Калі сьвіні танныя, забіваем, каб сала хапіла на цэлы год і ў растопленае сала заліваем у паліваных гаршкох усё мяса і каўбасы (чэхі ня вешаюць мяса ў сьвірнах, як гэта робіцца ў нас, і таму ня ведаюць, што такое мяса зьялчэе — р э д.). Не заліваю толькі сланіны. Да гэтага на зьмену ўзімку забіваю часам труса, а на вясну — якое казьлянё, часам курыцу ці якую дзіч. Увосені качку або гусю, а часам нешта каровяе. Гэтак маю найлепшы і найтанейшы выбар. Салам і сланінай сквару ўсякую гародніну, маслам— булку і інш. Гусінае і качае сала йдзе, як помазка на хлеб...

Гародніна ўжываецца штодзень усяляк прыпраўленая. Што астанецца ад абеду, запраўляецца яйком і даецца на вячэру. Звычайна-ж на вячэру даю малочную хлебную ці іншую зупу з бульбай варанай, печанай, тушанай і г. д. Бульбу для большага смаку часам заліваю злёгка маслам.— Іншы ўзноў раз даю на вячэру малако — прэснае або кішонае — сыр, масьлянку...

Калі хачу варыць ашчадна, ня смажу курыну ў м-цы красавіку, не вару яйка ў м-цы студні і г. д., калі ўсё гэта найдаражэйшае, тады ўсё гэта прадаю. Па новым годзе, калі ўсюды коляць, рэжаць, усё гэта таннае і тады раблю запасы мяснога, а масла тады дарагое і яго, старанна выврабленае і хораша ўкручанае, прадаю. Ці то будзе яйко, ці бульба, давайце на рынак усё перабранае, выцертае. Гэтым здабудзецца сабе сталых і добрых купцоў, якія самі будуць у вас цэлымі гадамі купляць і іншых яшчэ прывядуць.

Вясной укладаю яйкі ў солі; яйко гэтак вытрымае да зімы, а соль можна далей выкарыстаць. Варыва, якое цяпер ужо станела, сушу і заварваю. На рынак цяпер загатаўляю ранныя кураняты, качаняты і гусяняты. Калі рынак гэтым таварам запоўніцца, тады буду гэты тавар выкарыстоўваць сама ў сваёй гаспадарцы.

Улетку танее масла і яго тады пакідаю дома, ці то на хлеб, ці то перапускаю і захоўваю да смажэньня ў кухні. Тое самае з яйкамі.

Выбраныя ранныя садовыя фрукты прадам; калі-ж яны танныя, лепш іх засмажу, нараблю мармэляды, павідлаў, віна.

Хатнюю птушку, катарая на восень бывае таннай, выкармліваю: маю з яе мяса, зупу і сала. У гэту-ж пару знойдзецца ў гаспадарцы нейкае ягнё ці казьлянё: забіваю гэта, каб прылепшыць стол для работнікаў, што цяпер цяжка працуюць пры капаньні бульбы, буракоў. Усякія косьці растоўчаныя, астаткі ежы, абрэзкі варыва і фруктаў вельмі любіць хатняя птушка.

Час грыбоў: зьбіраю іх, а як не магу сама пайсьці ў лес — куплю, выменяю, але грыбы мецць мушу.

Аб усім гэтым можна было-б пісаць цэлыя кнігі. Усё мусім ўжываць з свае собскае гаспадаркі Часы цяжкія: чым далей будуць меншыя даходы, меншыя пасагі. Кожную дзяўчыну пашлеце ў гаспадыньскую школу, а не пасылайце яе вучыцца ў рэстаран ці на клябанію. Памятайце, што для гасьцей будзе варыць рады—ў—гады, але ашчадна і для гаспадаркі будзе мусіць варыць праз цэлае жыцьцё. Земляроб патрабуе добрую, ашчадную жонку, а ня даму да пячэньня тортаў, варэньня мокка і г. д. Жонка земляроба мусіць выкарыстаць і абярнуць усё ў грошы, а не разнасіць цэлую палову дня грошы да разьніка, цукерніка, вандлярніка ці да розных рэстаранаў.... У земляробстве жанчына кругом мае працу і ашчаднасьць, але яна і каралева сярод свайго каралеўства. Ці то ў кухні, ці ў агародчыку, паміж птушынай драбязой ці між жывёлай. Калі яна інтэлігентная і разумная, кожны яе паважае. — Калі хочаце выхаваць сваіх дочак на добрыя гаспадыні, пашлеце іх на практыку да іншай гаспадыні—навучыцца больш, як у хаце... І для нас настануць лепшыя часы, але іх мусім самі сабе прыгатавнць. А гэтага ад душы жадаю ўсім мужчынам і жанчынам.

(*„Zemёd. Jednota“ Nr. 1/32*).

Фр. Валькова.

Redaktar-Vydaviec inž. A. KLIMOVIČ

Biełaruskaja Drukarnia im. Fr. Skaryny, Vilnia, Zavalnaja 1—3.

ГАСПАДАРЧАЯ ХРОНІКА.

„Беларуская Борць“ — часопісь для справаў пчалярскіх і зёлкавых—пачала выходзіць у Вільні пад рэд. грам. Л. Войцікавай. Выдае беларускае Кооп. Т-ва „Пчала.“ Адрэс: Вільня, Каралеўская 3—8.

Новая тарыфа на пошце заведзена ад 1 кастрычніка сёлета ва ўсей Польшчы Выглядае яна гэтак: за краёвыя (не заграні̇чныя) пісьмы 25 грашоў, за паштоўкі (адкрыткі) 15 грашоў. За заграні̇чныя пісьмы —55 грашоў, за заграні̇чныя паштоўкі — 30 гр. Пісьмы ў Аўстрыю, Вугрыю (Мадзяршчыну), Чэхаславаччыну і Румынію — 45 грашоў, а паштоўкі — 25 грашоў.

Як падпісываць вэксалі. Найлепш, калі земляроб вэксалёў зусім ня ўжывае, бо гэта „ратунак“ надта небясьпечны. Калі-ж аднак вэксалю абмінуць ня можна, дык падпісаваць іх, згодна з вымогаю „Банку Польскага,“ трэба поўным імем—а ня толькі аднэй першай літарай — і прозьвішчам. Вэксалі падпісаныя скарочана Банк ня можа дысконтаваць. Скарочана можа падпісавацца толькі акцэптант (той, хто вэксаль мае заплаціць) і то тады толькі, калі пад подпісам ставіцца ягоны штамп, з каторага відаць выразны адрэс падпісваючага.

Вернуць ці ня вернуць? Нашы чытачы ведаюць ужо, якія няўстойкі пераживаў за сёлетняе лета агранамічны Аддзел Віленскага Унівэрсытэту. Вось-жа паводле апошніх вестак Аддзел гэты сапраўды вісіць між небам і зямлёй: запісы студэнтаў на гэты Аддзел прымаліся, школьны год ужо пачаўся, але афіцыяльнага пацьверджан ня з Варшаўскага міністэрства што Аддзел гэты будзе ненарушана далей існаваць, дагэтуль няма.

Можа будзе?

Закупы збожжа для войска. На абшары Віленшчыны вайсковая інтэндантура мае закупіць: у м-цы кастрычніку — 190 тонаў (у тоне 1.000 кілёграмаў, або 61 пуд) жыта і 600 аўса, у м-цы лістападзе 400 тон жыта і 500 аўса і ў м-цы сьнежні—156 т. жыта і 500 т. аўса.

Скуп коняў для войска. У міжчасе ад 8 кастрычніка да 13 сьнежня сёлета ў асобных гарадох і мястэчках нашага Краю будуць скупліваць коняў для войска. Рост каня павінен быць ня ніжэйшы 145 см. і ня вышэйшы 150 ст. Цана даволі разнародная, ад 300 да 3.000 злотаў, залежна ад якасьці каня Апрача таго большую цану атрымоўваюць тыя, хто належа да гадаўляных гурткоў, а таксама тыя, хто прадаванага каня сам выгадаваў, або прынамся гадаваў найменш 6 месяцаў. На зборным пункце трэба быць у азначаным дні ўжо а гадзіне 7 рана, каб дастаць карту ўступу. Бяз гэтай карты ніхто ня будзе магчы прадаць каня. З сабой трэба мець усе дакуманты аб каню. Зборныя пункты назначаныя ў наступным парадку: 8—9 кастрычніка — у Відзах, 10 кастрычніка — у Друі, 6 лістапада — у Ляхавічах, 7—8 лістапада — у Міры, 9 лістапада — у Навальні, 4 сьнежня — у Скрыбаўцах, 5 сьнежня — у Лідзе, 6 сьнежня — у Багданаве, 7 сьнежня — у Маладэчне, 12 сьнежня — Сьвянцянах і 13 сьнежня— у Глыбокім.

Наша пошта.

Коопэратыва „Поўня“ ў Бр.—Ваш рахунак у П.А.Т. зьменшаны да нормальнай вышыні, г. зн. да 10 зл. і 50 гр. Мы аб гэтым дасталі афіцыяльнае паведамленьне. Рэшту, г. зн. 63 зл. Вам мусіць быць вернена. Заслуга гэта кіраўніка нашага аддзелу праўных парадаў.

Коопэратыва „Самапомач“ у В. Л.: У Вас справа падобная, як пададзена вышэй. Прышлеце нам копіі сваей перапіскі (што каму пісалі і што скуль атрымоўвалі) у справе гэтай абвесткі, а мы папрабуем і Вашай справе даць належны ход. Не адцягівайце толькі.

Я. Вільк—і, Я. Мар—ч, С. Ур—ч і М. С—к: Дзякуем за выказаньне сваіх паглядаў на закранутую справу. Можа-б Вы ў сваіх ваколіцах сарганізавалі „дзесятку“ „Самапомачы?“

Б. Др—віч у С: Ня можам з прысланага скарыстаць, бо ані з гаспадаркай ані з беларушчынай ня мае гэта нічога супольнага.

Гаспадару ў Ж: Калі толькі можаце залажыць коопэратыву — закладайце. — Што да коопэратыўнай у Вас малачарні, дык ясная рэч, што яна вельмі карысная. На выпадак, калі-б ня можна было яе заснаваць як коопэратыву, закладайце як контрактовую супалку. Аб гэтакіх супалках „Самапомач“ будзе пісаць у найбліжэйшым часе.

Мір—к і П. Гап.—к: Адказы у справах адвакацкіх Вам высланы асобнымі пісьмамі: ці атрымалі?

Ал. Ан—к: Атрымалі і падзялілі павопле Вашай волі.


Б. За—м, С. С—скі, М. М—р і Д. Н—ая: атрымалі; пачнём высылку Курсу Коопэрацыі ў гэтым ужо месяцы.

УВАГА! *УВАГА!*

Пры рэд. «Самапомачы» ўведзены аддзел праўных парадаў, якім кіруе безінтэрасоўна беларуская адвакацкая сіла Асобы, якія маюць якіясь пытаньні, павінны іх ясна і выразна напісаць на пісьме і прыслаць у нашу рэдакцыю. Адказы — невялікія будуць друкавацца ў «Самапомачы». На адказы большыя трэба далучыць паштовую марку за 25 грашоў.

Рэдакцыя
„САМАПОМАЧЫ“

Pierasyłka apłačana ryčałtam.





CANA NUMARU 40 HRAŠOŬ